**Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у чэрвені**

Летам бібліятэкі ДУК “Лунінецкая РЦБС” становяцца своеасаблівым цэнтрам вольнага часу і творчасці і прапануюць дзецям паўдзельнічаць у разнастайных мерапрыемствах.

**1 чэрвеня. ЦДБ**. Бібліятэка прыняла ўдзел у гарадскім свяце “Этот мир мы дарим детям”, прысвечанае Міжнароднаму дню аховы дзяцей. Супрацоўнікі бібліятэкі правялі літаратурную віктарыну «Здравствуй, солнечное лето!» і пазнаёмілі дзяцей з кніжнай выставай «У книжек нет каникул». Пераможцы віктарыны атрымалі Дыпломы.

**5 чэрвеня. Мікашэвіцкая г.б.** Адбыўся мультмарафон «Герои книг – герои мультфильмов». Дзеці ўдзельнічалі ў разнастайных гульнях “Клубочак” (па знакамітых мультфільмах), “Даведайся героя” (дзеці малявалі добрых і злых герояў мімікай і жэстамі, адказвалі на пытанні віктарыны і разгадвалі загадкі-падманкі.

Прайшлі мерапрыемствы ў сельскіх бібліятэках. Так, у **Рэдзігераўскай** сельскай бібліятэцы прайшла гадзіна зносін «Будем делать хорошо и не будем плохо», у **Дрэбскай** сельскай бібліятэцы-клубе прайшло адкрыццё летніх чытанняў “Маленькие дети на большой планете”, у **Вялуцкай с.б.** – литаратурна-гульнявая праграма «Детству солнце подарите», у **Бродніцкай** сельскай бібліятэцы-клубе прайшла акцыя «Лето начинается!» і інш.

**5 чэрвеня. ЦБ.** У духоўна-асветніцкім цэнтры “Истоки” адбылася праваслаўная гадзіна «Небесная заступница земли белорусской». У мерапрыемстве прыняў удзел настаяцель храма Казанскай іконы Божай Маці (в. Рэдзігерава), іерэй Аляксандр Барысаў.

Прайшлі мерапрыемствы да **225-годдзя з дня нараджэння** рускага паэта **А.С. Пушкіна.**

**6 чэрвеня. ЦБ.** Адбылася літаратурна-тэатралізаваная вандроўка “В волшебной Пушкинской стране”.

**6 чэрвеня. ЦДБ.** Для дзяцей прышкольнага лагера школы №4 правялі гульню «Остров сказок». На працягу мерапрыемства дзеці ўспаміналі любімыя казкі, адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарыны.

Бібліятэкі праводзяць актыўную работу па прафілактыцы бяспекі жыццядзейнасці. На працягу тыдня прайшлі прафілактычныя мерапрыемствы па папярэджванні надзвычайных сітуацый, правапарушэнняў і злачынстваў.

**12 чэрвеня. ЦБ.** Для выхаванцаў адзялення дзённага знаходжання Лунінецкага ТЦСАН адбылася інфармацыйная гадзіна «Безопасность в быту, или Один дома». Мэтай мерапрыемства з’яўлялася актуалізацыя ведаў хлопчыкаў і дзяўчынак аб небяспечных сітуацыях дома.

**13 чэрвеня. ЦБ.** Адбыўся раённы семінар бібліятэчных работнікаў «Библиотечные фонды: принципы организации и изучение эффективности использования».

**14 чэрвеня. ЦБ.** Прайшоў прававы практыкум для пажылых людзей «Кибербезопасность: как защитить себя в Интернете». На мерапрыемства

запрасілі адваката юрыдычнай кансультацыі Лунінецкага раёна Тамару Аляксееўну Грыцкевіч. Яна расказала ўдзельнікам мерапрыемства, як не стаць ахвярай кіберзлачынцаў і інтэрнэт-хакераў. Пенсіянеры даведаліся, што такое персанальная інфармацыя, пазнаёміліся з правіламі бяспечных паводзін у сетцы, вучыліся здзяйсняць бяспечныя анлайн-пакупкі. Напрыканцы адвакат правяла бясплатную прававую кансультацыю.

Сярод удзельнікаў гэтых мерапрыемстваў былі распаўсюджаны інфармацыйныя матэрыялы і буклеты, выдадзеныя супрацоўнікамі публічнага цэнтра прававой інфармацыі: “Правілы бяспечных паводзін дома”, “Твая асабістая бяспека”, “Лічбовая бяспека ў Інтэрнэце”, “Фішінг: як распазнаць і як абараніцца”, “Што такое “вішынг”?” і інш.

Прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Дню памяці і смутку і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Перад днём памяці і смутку ў абеліскаў загінуўшым воінам-аднавяскоўцам супрацоўнікі бібліятэк правялі памятныя мерапрыемсты з ускладаннем кветак. Так, **Дрэбская сельская бібліятэка-клуб** правяла урок памяці “Свяча памяці”, **Лахвенская сельская бібліятэка** – урок памяці “Помнім. Ганарымся”, **Рэдзігераўская с.б.** – урок памяці “Памяць і боль беларускай зямлі”.

**21-22 чэрвеня. ЦБ.** У бібліятэцы адбылася дыялогавая пляцоўка «Нам жить и помнить» з удзелам кіраўніка ваенна-патрыятычнага выхавання СШ №1 Н.І. Вячорка. У **ЦДБ** прайшоў ўрок-пратэст “Дзеці і вайна”.

У **Мікашэвіцкая г.б.** прайшоў цыкл мерапрыемстваў. Так, **20 чэрвеня** ў бібліятэцы прайшла літаратурная гадзіна “Поэты военной поры”, а для дзяцей прышкольнага лагера гімназіі імя В.Нядзведскага прайшла інформ-мінутка “Минувших дней живая память”. **21 чэрвеня** для маладых інвалідаў клуба “САМИ” ЛТЦСАН г.Мікашэвічы прайшоў урок мужнасці “Тот самый чёрный день в году”.

Плаўсюк 4 82 52